# Археалогія



Дзяніс ДУК

# АД РАГВАЛОДА ДА ІВАНА ГРОЗНАГА: ВЕРХНІ ЗАМАК У САЦЫЯЛЬНАЙ ТАПАГРАФІІ ПОЛАЦКА



*ДУК Дзяніс Уладзіміравіч — загадчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі Полацкага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1977 г. у Навапалацку. У 1999 г. закончыў гістарычна-філалагічны факультэт Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Займаецца археалогіяй і гісторыяй Полаччыны, вывучае гісторыю матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка XVI—XVIII стст. Аўтар манаграфіі «Полацк XVI—XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада» (Навапалацк, 2007), вучэбна-метадычных комплексаў «Гісторыя Полацка: па матэрыялах археалагічных даследаванняў» (Навапалацк, 2006), «Археалогія» (Навапалацк, 2009) і больш за 70 навуковых публікацый.*

У гістарычнай тапаграфіі Полацка вызначаюцца два замкі — Верхні і Ніжні (Стралецкі). Першы размешчаны на гары пры вусці р. Палаты і менавіта з яго гісторыяй цесна звязаны такія многія важныя для гісторыі Полацка падзеі, як, напрыклад, узвядзенне Сафійскага сабора ў XI ст. З цягам часу Верхні замак стаў галоўнай крэпасцю Полацка. Ён быў апошні прытулак для абаронцаў горада ў 1563 г. Калі замкавая брама была адчынена войскам Івана Грознага, гэта азначала страту Полацка для Вялікага княства Літоўскага.

Выключнае значэнне Верхняга замка ў шэрагу палітычных падзей, яго выгоднае размяшчэнне на ўмацаванай самой прыродай гары абумовіла асаблівы статус дадзенай тэрыторыі. У гістарыяграфіі склалася меркаванне аб пераносе старажытнага полацкага дзяцінца (IX—X стст.) з гарадзішча на Верхні замак. Гэты працэс вызначаецца даследчыкамі ў межах XI ст.[1].

Сёння, калі атрыманы доказы пра існаванне княжацкай рэзідэнцыі на гарадзішчы да пачатку XIV ст., тэзіс пра перанос дзяцінца выглядае не зусім правамоцным. Аднак адмаўляць той факт, што Верхні замак з XI ст. з'яўляўся месцам пражывання сацыяльнай эліты і выконваў важныя адміністрацыйныя функцыі, таксама нельга.

У сувязі з гэтым узнікае пытанне: якую ролю ў сацыятапаграфічнай структуры Полацка выконваў Верхні замак у XI—XVIII стст.? Каб адказаць на яго, неабходна высветліць функцыянальнае прызначэнне замкаў у структуры старажытных усходнеславянскіх гарадоў і дынаміку забудовы і засялення Верхняга замка Полацка.

Пачаткова на дзяцінцы старажытнарускага горада пражывалі малодшыя дружыннікі ("дзецкія") і баяры ("сільныя мужы")[2]. З моманту развіцця феадальных адносін князь усё больш абапіраецца на малодшую дружыну ("княжых дзяцей"). На дзяцінцы размяшчаліся рамесныя майстэрні і пражывала вялікая колькасць насельніцтва[3]. Тут знаходзіліся гарадскі сабор, цэрквы, княжацкія церамы, а таксама кром — сховішча прадуктаў гарадской абшчыны. Пры гэтым памеры дзяцінцаў беларускіх гарадоў рэдка перавышалі 2 га (Берасце, Клецк, Пінск, Слуцк)[4] ці 3 га (Мінск)[5]. Дзяцінец быў ідэалагічным цэнтрам, месцам, дзе канцэнтраваліся рамеснікі і пражывалі прадстаўнікі свецкай і духоўнай адміністрацый горада, на ім у час ваеннай небяспекі хаваўся пасадскі люд.

Паводле А.М.Ляўданскага і М.М.Ціхамірава, пасля адбудовы Верхняга замка на гарадзішчы працягвала існаваць пасяленне, якое вызначаецца як "асобы княжацкі двор"[6]. Што тычыцца Верхняга замка Полацка, то сляды дзейнасці княжацкай адміністрацыі фіксуюцца па наяўнасці непадалёк ад Сафійскага сабора княжац-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Рэканструкцыя плана мураванага церама (паводле П.А.Рапапорта).*



кіх* храма Архангела Міхаіла і церама. Гэтыя помнікі манументальнага дойлідства выяўлены археалагічна, звесткі ў пісьмовых крыніцах аб іх існаванні адсутнічаюць. Па меркаванню П.А.Рапапорта, царква і церам былі пабудаваны ў другой палове XII ст.[7].

Церам уяўляў сабой невялікую, амаль квадратную ў плане мураваную пабудову, памерам 4,7 х 4,2 м. З захаду да яе прымыкала другая, яшчэ меншая, прыбудова — 2,5 х 2,4 м. З паўночнага боку ўшчыльную да мураванага церама прыстасавана зрубная драўляная канструкцыя. Вонкавыя памеры зруба гэтай прыбудовы — 5,3 х 5,4 м. У ёй захаваліся сляды драўляных плах падлогі з рэшткамі печышчаў рознага часу[8].

Для ўдакладнення пытання аб датаванні часу пабудовы церама варта прааналізаваць змест справаздач П.Рапапорта аб раскопках, праведзеных у Полацку ў 1976—1977 гг. Церам, складзены з плінфы, быў даследаваны ў 1976 г., а драўляная прыбудова каля яго — у 1977 г.[9].

З тэксту справаздачы 1976 г. можна даведацца, што:

1) Знешні памер сцен мураванага церама 4,7 х 4,2 м. Падмурак церама складзены з камянёў на вапнавай рошчыне, ён заглыблены ў чорны культурны пласт, а яго падэшва абапіраецца на мацярык — шчыльны жоўты пясок.

2) Глыбіня залягання мацерыка на ўчастке раскопа — 2,2—2,4 м. На глыбіні 1,2—1,4 м пачынаецца магутны культурны пласт са знаходкамі XII—XIII стст., у які і быў заглыблены падмурак церама.

3) Памеры цэглы з церама — 3,5—3,8 х 15—16 х 26,5—29 см. Пры гэтым падкрэслена, што "лекальных кирпичей или кирпичей обычного (широкого) формата нет". Знакі на тарцах цэглы знойдзены ў невялікай колькасці. Рошчына-цамянка без вялікіх дамешак шамота.

4) Характар муроўкі сцен не высветлены, хоць былі знойдзены асобныя кавалкі цэглы, замацаванай рошчынай у некалькі радоў. Зроблена дапушчэнне, што муроўка была са "схаваным радам"[10].

5) Драўляная прыбудова добра злучана з цаглянай і ўяўляе адзіны комплекс.

Відавочна, што спосаб закладкі падмурка церама дазваляе вызначыць час яго будаўніцтва ў XIV ст., пасля таго, як утварыўся "магутны культурны пласт XII—XIII стст.". Памер цэглы набліжаны да брусковай і добра вядомы ў Полацку па знаходках у Экімані і Запалоцці. Датаванне рэштак самай ранняй з пяці печаў, раскапаных у драўлянай прыбудове, вызначана, паводле дэндрахраналогіі, 1304 г.[11]. Такім чынам, час будаўніцтва церама з плінфы і драўлянай прыбудовы каля яго можна вызначыць не раней за XIV ст.

Можна пагадзіцца з распаўсюджанай думкай аб прыналежнасці церама ў XIV—XVI стст. да комплексу княжацкага двара. Магчыма, што ў гэты час на Верхнім замку існавала гарадская сядзіба князя на-



*Расчыстка драўляных плах асновы драўлянай прыбудовы.* Раскопкі П.А.Рапапорта. 1977 г.

* *Гэтае вызначэнне распаўсюджана ў гістарыяграфіі, але яно не падмацавана звесткамі гістарычных крыніц.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

кшталт Яраслававa Дворышча ў Ноўгарадзе. Аднак не выключана і іншае. Церамы на Русі выяўлены ў Пераяслаўлі, Чарнігаве, Смаленску, Гародні, але яны не заўсёды належалі князю, нярэдка — епіскапу.

Факт выкарыстання гарадзішча як жылой рэзідэнцыі полацкіх князёў у IX—XIII стст. цяжка аспрэчыць (падчас археалагічных раскопак была засведчана наяўнасць багатага на элітарныя знаходкі і стратыграфічна стракатага культурнага пласта, існаванне рамесных майстэрняў, царквы)[12]. Падобная сітуацыя назіралася ў старажытным Ноўгарадзе, дзе існавала процістаўленне Дабравешчанскага сабора на гарадзішчы Сафійскаму сабору на Яраслававым Дворышчы.

Дзейнасць епіскапа на Полацкім Верхнім замку прасочваецца даволі яскрава ў першую чаргу па пісьмовых (лакалізацыя ў XIV—XVII стст. епіскапскага двара*) і археалагічных (адкрыццё ў 1980 г. жылога драўлянага дома XIV—XV стст. непасрэдна каля Сафійскага сабора) крыніцах[13].

Сітуацыя з размяшчэннем княжацкага двара змянілася ў пачатку XIV ст., калі Полацк увайшоў у склад ВКЛ. Пасля "цьмянага" для Полацка перыяду тэакратычнай улады, пасля 1326 г., калі на княжанне ў Полацку быў пасаджаны брат Гедзіміна — Воінь, княжацкая рэзідэнцыя на гарадзішчы спыніла сваё існаванне. Праз некалькі стагоддзяў яно было канчаткова закінута і стала гарадскімі могілкамі.

Неабходна адзначыць, што на полацкім гарадзішчы разам з князем і дружынай жылі рамеснікі. Для Верхняга замка гэтая сітуацыя не была характэрнай. Тут у XI—XIII стст. размяшчаліся цэрквы, княжацкі церам і епіскапскі двор. Выяўленая сядзібная забудова рамеснікаў (ювеліраў, кастарэзаў, кавалёў і інш.) у XI—XIII стст. размяшчалася каля Верхняга замка, фактычна на пасадскай тэрыторыі.

На тэрыторыі Верхняга замка не знойдзена слядоў рамеснай вытворчасці. Культурныя напластаванні XI—XIII стст. на Верхнім замку невялікія па магутнасці і не вылучаюцца разнастайнасцю знойдзеных артэфактаў (на гарадзішчы назіраецца адваротная сітуацыя). Нарэшце, на Верхнім замку адсутнічаюць сляды крапасных умацаванняў XI—XIII стст.



*Паўночная сцяна мураванага церама.*
Раскопкі П.А.Рапапорта. 1977 г.

Абарончая функцыя была адной з галоўных функцый дзяцінца. Сляды магутных абарончых умаца-



*Ніжні рад цэглы на падмурку паўночнай сцяны церама.*
Раскопкі П.А.Рапапорта. 1977 г.

* *Самая ранняя дата — 1309 г.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ванняў выяўлены практычна ва ўсіх гарадах двух буйнейшых старажытных княстваў на тэрыторыі сучаснай Беларусі — Полацкага і Тураўскага. Так, дзяцінцы ўсіх буйных гарадоў Тураўскай зямлі (Турава, Берасця, Давыд-Гарадка, Пінска) у XI ст. мелі ўнутрывальныя канструкцыі, равы і сістэму крапаснай забудовы. Аднак на Верхнім замку Полацка не выяўлена надзейных слядоў наяўнасці крапасных умацаванняў, якія можна датаваць раней за XIV ст. *A priori* лічыцца, што яны павінны былі існаваць. Паказальна ў гэтым плане меркаванне Л.В.Аляксеева, які адзначае, што менавіта пры полацкім князе Усяславе Брачыславічы (1044—1101) была пабудавана "магутнейшая крэпасць на Замкавай гары ў Полацку, падобная на тую, якую ўзвёў яго сын на верхняй Свіслачы, назваўшы Мінскам"[14].

На нашу думку, Верхні замак у разглядаемы перыяд не меў значных абарончых умацаванняў, а быў уключаны ў агульную сістэму пасадскай фартыфікацыі, якая існавала з XI ст. і была досыць разгалінаванай. У XI ст. Верхні замак набыў функцыю хрысціянскага сакральнага цэнтра замест былога язычніцкага. Не адмаўляючы прысутнасць на замчышчы абарончай сцяны, адзначым, што яна магла быць зроблена з востракола і пакуль што археалагічна не выяўлена. Ускосным доказам аб адсутнасці магутных абарончых збудаванняў Верхняга замка ў XI—XIII стст. з'яўляецца вялікі культурны пласт і характар забудовы ўсходняй часткі Замкавай гары — былой пасадскай тэрыторыі. Асноўныя археалагічныя даследаванні Верхняга замка праводзіліся менавіта тут і практычна нідзе не было зафіксавана выразных рэштак крапаснай сцяны. За адным выключэннем.

Так, у 1957 г. на глыбіні 3,2—3,3 м была выяўлена ўнутрывальная канструкцыя, аднесеная М.К.Каргерам да будаўнічага яруса 1[15]. Канструкцыя складалася з 2—3 радоў невялікіх акруглых бярвенняў і некалькіх цясаных плах, якія пакладзены перпендыкулярна адна на адну. Паміж бярвеннямі зафіксавана гліна. Канструкцыя выяўлена на глыбіні 3,7—3,8 м ад зямной паверхні (мацярык размяшчаўся на глыбіні 5,88 м). Пад адзначанымі канструкцыямі зафіксаваны будаўнічыя ярусы 2 і 3. Шматлікі рэчавы матэрыял, знойдзены ў раскопе, датаваны XI—XIII стст.

Выяўленыя фрагменты абарончых умацаванняў дапаўняюцца паведамленнем А.Р.Мітрафанава, які прымаў удзел у раскопках 1957 г. У раскопе 1959 г. у перадапошнім будаўнічым гарызонце на глыбіні 5 м былі выяўлены бярвенні ўнутрывальнай канструкцыі, у працяг яе на месцы корпуса бальніцы ў 1957 г. М.Каргерам выяўлены рэшткі дубовых варот. Паколькі ўся канструкцыя размяшчалася на культурным пласце, застаецца канстатаваць той факт, што яна не ўзнікла сінхронна з засяленнем тэрыторыі Верхняга замка.

Ды і ці маглі замкавыя ўмацаванні праходзіць каля падэшвы пасадскай тэрыторыі? Малаверагодна. З улікам інтэнсіўнага нарастання культурнага пласта ўсходняя частка была вышэйшая за асноўную пляцоўку замчышча. Верхні замак з усіх бакоў, акрамя ўсходняга, мае надзвычай добрыя прыродныя ўмацаванні ў выглядзе стромкіх высокіх схілаў вышынёй больш за 10 м. Таму можна зрабіць выснову, што адкрытыя рэшткі абарончай сцяны маглі належаць альбо вакольнаму гораду XI ст., альбо пасаду XII—XIII стст.

У XIV—XVI стст. тэрыторыя Верхняга замка па перыметру з вонкавага боку была абнесена драўлянымі ўмацаваннямі. Іх сляды ў заходняй і, магчыма, паўднёвай частцы Верхняга замка зафіксаваны археалагічна[16].

З прыведзеных даных вынікае, што Верхні замак у XI—XIII стст. хутчэй за ўсё не меў магутнай сістэмы крапасных умацаванняў. У гэтым не было вялікай патрэбы, улічваючы адсутнасць на Верхнім замку княжацкага двара і зручнае размяшчэнне на ўмацаваным самой прыродай, акружаным з трох бакоў вадой пагорку. І нават той факт, што з XIV ст. на Верхнім замку размяшчаецца двор полацкіх епіскапаў, а ў Сафійскім саборы захоўваецца гарадскі скарб і бібліятэка, не можа з'яўляцца доказам існавання на ім княжацкай рэзідэнцыі.

У супрацьвагу гэтаму неабходна адзначыць, што на гарадзішчы былі знойдзены выразныя сляды крэпасці, якія складаліся з вала, рэштак драўляных канструкцый і каменных падмостак. Да сённяшняга дня з паўночнага боку гарадзішча захаваліся сляды вала і дзвюх тэрас ля яго падэшвы. Гэтыя тэрасы, магчыма, з'яўляюцца рэшткамі старажытнага ўзвоза на гарадзішча. Княжацкая рэзідэнцыя была надзейна ўмацавана і менавіта яна выконвала функцыю абароны пасадскага люду.

Адсутнасць культурнага пласта X ст. на Верхнім замку, але наяўнасць асобных артэфактаў гэтага часу сведчыць на карысць таго, што на пляцоўцы замчышча пачаткова знаходзіўся язычніцкі культавы цэнтр. На гэта ўказваюць і асаблівасці размяшчэння, і спецыфіка забудовы дадзенага аб'екта ў гарадской тапаграфіі старажытнага Полацка[17]. Час засялення Верхняга замка можна падзяліць на два перыяды. Першы з іх — калі вакольны горад, які працягнуўся ад гарадзішча ўздоўж Палаты, дасягнуў мяжы замкавай гары каля яе ўсходняй падэшвы. З гэтым перыядам на месцы так званых "усходніх раскопах" на Верхнім замку звязаны знаходкі ляпнога посуду, манеты візантыйскага імператара Рамана І (919—944 гг.), куфічны дырхем, шкляныя пацеркі-лімонкі, аднабаковыя касцяныя грабяні. Культурны пласт гэтага часу не вылучаецца даследчыкамі як самастойны і разглядаецца разам з пластом XI ст. Акрамя таго, ва ўсходняй частцы Верхняга замка, у т. зв. Машне і каля Сафійскага сабора, культурных напластаванняў, якія датуюцца раней за XII ст., увогуле няма. Артэфакты XI ст. у ніжнім стратыграфічным пласце прадстаўлены пераважна керамічным посудам, які датуецца ў межах XI—XII стст. Гэта сведчыць пра тое, што тэрыторыя, на якой будаваўся Сафійскі сабор, у сярэдзіне XI ст. не была заселена. Вакольны горад займаў тэрыторыю каля падэшвы Верхняга замка. Далейшае імклівае развіццё сядзібнай забудовы абумовіла хуткае нарастанне культурнага пласта, што з цягам часу прывяло да пашырэння тэрыторыі Верхняга замка ва ўсходнім кірунку за кошт уласна пасадскай тэрыторыі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пашырэнне Верхняга замка за кошт уключэння ў яго межы часткі пасадскай тэрыторыі (на месцы так званых "усходніх раскопаў" 1959—1962 гг.) магло адбыцца толькі пасля пабудовы крапасной сцяны. Самыя раннія па часе рэшткі абарончых умацаванняў Верхняга замка зафіксаваны на яго заходнім схіле і паводле дэндрахраналагічнага аналізу датуюцца XIV ст. У той жа час адбылася перапланіроўка грамадзянскай забудовы ўсходняй часткі Верхняга замка[18]. Гэтыя працэсы — магчымае сведчанне пашырэння замкавай тэрыторыі на ўсход за кошт часткі пасадскай.

Асноўная функцыя Верхняга замка ў XI—XVI стст. — старажытны сакральны цэнтр, які выкарыстоўваўся і для адміністрацыйна-цырыманіяльных мэтаў. Акрамя таго, Верхні замак мог з'яўляцца месцам дзейнасці князя (XI—XIV стст.), магчыма, і яго пражывання (пасля 1326 г.). На Верхнім замку жылі княжацкі намеснік (з 1392 г.), ваявода (з 1504 г.), полацкі епіскап, баяры і мяшчане, на яго тэрыторыі размяшчаліся шэраг манастыроў і Сафійскі сабор.

Такім чынам, пры супастаўленні ўсяго комплексу гістарычных крыніц вынікае, што дзяцінец Полацка ў IX—XIII стст. існаваў на старажытным полацкім гарадзішчы, а з пачатку XIV ст. яго функцыі стаў выконваць Верхні замак.

Адміністрацыйны цэнтр горада пасля надання Полацку магдэбургскага права (1498 г.) і пабудовы гарадской ратушы (пасля 1509 г.) быў перанесены на гарадскую плошчу. У XVI—XVII стст. на Верхнім замку размяшчаліся двары ваяводы і прадстаўнікоў сацыяльнай эліты горада, ён з'яўляўся сакральным цэнтрам, месцам захоўвання гарадскога скарба і бібліятэкі, нарэшце, самай значнай полацкай крэпасцю. На яго ўмацаванне выдаткоўваліся асноўныя сродкі і захоп замка ў 1563 г. азначаў для ВКЛ страту Полацка. У сярэдзіне XVII ст. Верхні замак згадваецца пад назвай "вялікі горад"[19], на ім жылі прадстаўнікі полацкага набілітэту (ваяводы), мяшчане і духавенства, тут быў размешчаны гарнізон замкавай варты. Гайдукі (вартаўнічыя) Верхняга замка жылі, як правіла, тут жа ў сваіх дамах разам з жонкамі і дзецьмі.

На сённяшні дзень пры наяўнасці звестак аб шматлікіх паходах на Полацк у перыяд з 980 г. (забойства Рагвалода Уладзімірам Святаславічам) па 1563 г. доказы аб захопе полацкага дзяцінца (спачатку гарадзішча, а з XIV ст. — Верхняга замка) адсутнічаюць. Пры наяўнасці комплексу грамадзянскай архітэктуры архітэктурнай дамінантай Верхняга замка ў XVI ст. працягваў заставацца Сафійскі сабор.

У 1563 г., падчас захопу горада войскамі Івана Грознага, быў пабудаваны Ніжні замак. З таго часу замест тэрміна "горад" у дачыненні да замчышча стаў ужывацца тэрмін "Верхні замак". Прызначэнне Ніжняга замка — ахова гарнізона стральцоў і абарона паўночна-ўсходняй часткі Верхняга замка як асноўнай фартэцыі. Аднак гэтая функцыя сябе не апраўдала ўжо ў 1579 г. Як вядома, штурм горада войскамі ВКЛ адбыўся з адваротнага боку, і пад удар трапіў Верхні замак. Пасля яго захопу ўтрыманне Ніжняга замка станавілася бессэнсоўным. Канчаткова абарончую функцыю Ніжні замак страціў у пачатку XVIII ст. і з таго часу становіцца месцам жыхарства маргінальнай часткі насельніцтва Полацка.

Падводзячы вынікі даследавання, можна зрабіць выснову, што дзяцінец Полацка ў IX—XIII стст. існаваў на старажытным полацкім гарадзішчы, а з пачатку XIV ст. яго функцыі стаў выконваць Верхні замак. Пры гэтым асноўная функцыя Верхняга замка ў XI—XVI стст. — старажытны сакральны цэнтр, які выкарыстоўваўся і для адміністрацыйна-цырыманіяльных мэтаў. Акрамя таго, Верхні замак мог з'яўляцца месцам дзейнасці князя (XI—XIV стст.), магчыма, і яго пражывання (пасля 1326 г.). На Верхнім замку жылі княжацкі намеснік (з 1392 г.), ваявода (з 1504 г.), полацкі епіскап, баяры і мяшчане, на ім размяшчаўся шэраг манастыроў і пабудаваны Сафійскі сабор. Выкарыстанне тэрміна "дзяцінец" у дачыненні да Верхняга замка правамоцна толькі з пачатку XIV ст.

---

1 Тарасаў С.В. Полацк IX—XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія. Мн., 1998. С. 37; Тихомиров М.Н. Древнерусские города. М., 1956. С. 26; Штыхов Г.В. Древний Полоцк (IX—XIII вв.). Мн., 1975. С. 33.

2 Штыхаў Г.В. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. Мн., 1999. С. 36.

3 Фроянов И.Я., Дворниченко А.Ю. Города-государства Древней Руси. Л., 1988. С. 33.

4 Лысенко П.Ф. Туровская земля IX—XIII вв. Мн., 1999. С. 78—109.

5 Загорульский Э.М. Возникновение Минска. Мн., 1982. С. 80.

6 Тихомиров М.Н. Древнерусские города. С. 26.

7 Раппопорт П.А. Полоцкое зодчество XII века // Советская археология. 1980. № 3.

8 Раппопорт П.А., Шолохова Е.В. Дворец в Полоцке // Краткие сообщения института археологии АН СССР. М., 1981. № 164. С. 91—99.

9 Раппопорт П.А. Отчёт об археологических раскопках 1976 г. // Архіў Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей — ІГНАНБ), воп. 1, спр. № 527; Раппопорт П.А. Отчёт об археологических раскопках 1977 г. // Архіў ІГНАНБ, воп. 1, спр. № 574.

10 Раппопорт П.А. Отчёт об археологических раскопках 1976 г. С. 12—14.

11 Заяц Ю.А. О постройке с изразцовыми печами возле княжеского терема в Полоцке // Гістарычна-археалагічны зборнік. 1997. № 12.

12 Дук Д.У. Станаўленне Полацка ў IX—XIII стст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2007. № 11. С. 25—31.

13 Тарасаў С.В. Полацк IX—XVII стст. С. 68—70.

14 Алексеев Л.В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры: в 2 кн. Кн. 1. М., 2006. С. 103.

15 Каргер Н.К. отчёт о работе полоцкой археологической экспедиции в 1957 г. // Архіў ІГНАНБ, воп. 1, спр. № 25. С. 4—5.

16 Булкин В.А. Отчёт об археологических исследованиях Софийского собора и прилегающих к нему территорий в 1978 году // Архіў ІГНАНБ, воп. 1, спр. № 594, с. 9—11; Тарасаў С.В. Полацк IX—XVII стст. С. 41.

17 Лобач У.А. Да пытання аб сакральнай тапаграфіі старажытнага Полацка // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. Полацк, 2009. С. 112—119.

18 Штыхов Г.В. Древний Полоцк. С. 38.

19 Витебская старина / сост. А.Сапунов. Т. IV: Витебск. С. 273.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова